ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З КРАСАВІКА 1955 ГОДА ● ● № 7 (3643) ● ● ЧАЦВЕР, 29 ЛІПЕНЯ, 2021

ВЫДАННЕ "ГОЛАС РАДЗІМЫ" ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY



Паклон зямны і медалі
Стар. 2



Купалле з працягам
Стар. 5



Даўні след на новым палатне
Стар. 7

ПАДЗЕЯ

## Таленты збірае Віцебск

На цырымоніі адкрыцця XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" Аляксандр Лукашэнка заявіў: гэтую штогадовую падзею ўдалося ўпісаць у каляндар культурнага жыцця многіх народаў

БЕЛТА



**Аляксандр Лукашэнка ў Віцебску**

Збіраць і ствараць заўсёды цяжэй, чым разбураць. Парасткі культуры — вельмі чулліва да навакольля, далікатныя, патрабуюць асаблівых умоў для росту. І ў Беларусі тое ведаюць, бо не раз ужо ў гісторыі зямля наша, народ вымушаныя былі нанова ствараць тое, што гублялася ў выніку розных халадоў-пажараў, варожых нашэсцяў. І ў 90-х, як не стала ранейшай вялікай дзяржавы, беларусы здолелі задаць стваральны рытм новай, паяднальнай культурнай традыцыі. "Наш фестываль стаў першай маштабнай культурнай падзеяй пасля развалу Савецкага Саюза. Калі былі разарваныя тысячы нітак, што звязваюць братнія народы, ніхто нават уявіць сабе не мог, якая роля была наканаваная "Славянскаму базару". Тры дзесяцігоддзі таму мы пачалі шлях "праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення", і нам удалося ўпісаць сваё свята ў каляндар культурнага жыцця многіх народаў, паяднаць аднадумцаў больш чым з 70 краін", — заявіў 15 ліпеня на цырымоніі адкрыцця фестывалю Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, калі на карце свету з'явіліся новыя славянскія і еўразійскія дзяржавы, калі ў гісторыі розных народаў пачалася новая эпоха, то людзям, разгубленым і адарваным адзін ад аднаго, як ніколі патрэбна была надзея на зберажэнне духоўных і братніх сувязяў. Гэтую надзею ім падарыў "Славянскі базар": "Ён даў усім упэўненасць у будучыні, падмурак якой быў закладзены савецкімі традыцыямі міжнацыянальнага міру". Што да саміх беларусаў, то фестываль стаў для нас адным з сімвалаў станаўлення незалежнай дзяржавы. Хоць бывалі вельмі няпростыя часы, але мы, нагадаў Аляксандр Лукашэнка, бераглі "Славянскі базар", і насуперак усім цяжкасцям свята жыло.

Прэзідэнт канстатаваў, што разам з фестывалем вырасла цэлае пакаленне беларусаў, ён пусціў моцныя карані на зямлі, якую па праве можна лічыць калыскай беларускай самабытнасці: "Віцебшчына, якая падарыла нам Шагала, Пэна, Азгура, Быкава і Фрадкіна, стала цэнтрам прыцягнення для творчых людзей у XXI стагоддзі".

Сёння, з гордасцю адзначыў Аляксандр Лукашэнка, фестываль у Віцебску — гэта самы аўтарытэтны міжнародны конкурс прафесійнага вакальнага майстэрства: "Падкрэслю — конкурс прафесійнага майстэрства, а не шоу-тэхналогій, створаных толькі для іміджа і жадання пацешыць нечае самалюбства. Ён існуе ў імя людзей, дружбы і адзінства, таму што толькі ў адзінстве народаў ёсць сіла, здольная пераадольваць любыя перашкоды. І як бы ні курчыліся ў інсінуацыях крытыкі дзяржаўнай і маёй асабістай падтрымкі "Славянскага базару", мы яго адстаялі і ні разу не пашкадавалі, што кожны год праводзім гэты выдатны фестываль".

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што прыязджаюць на фестываль артысты, мастакі, рамеснікі з розных краін і кантынентаў і заўсёды гавораць тут на адной мове: мове дружбы, мастацтва і творчасці: "А таму ніткі "Славянскага базару" працягваюць злучаць людзей у свеце, які даўно ўжо не быў такім падзеленым, як цяпер — і не толькі пандэміяй і гібрыднымі войнамі". Аляксандр Лукашэнка вобразна выказаўся на гэты конт: у той час, як некаторыя дзяржавы будуюць платы, падзяляючы людзей калючым дротам, Беларусь адчыніла свае дзверы для сяброў.

Яркае, вобразнае выступленне Аляксандра Лукашэнкі цёпла ўспрынялі шматлікія гледачы. Прэзідэнт ад усёй душы падзякаваў "артыстам і арганізатарам, жыхарам і гасцям Віцебска — усёй вялікай сям'і фестывалю — за тое, што, як і 30 гадоў таму, мы адчуваем гэтую дзівосную атмасферу свята і народнага адзінства". І павіншаваў "Славянскі базар" з юбілеем.

Сярод мноства розных імпрэзаў, якія ўжо традыцыйна праходзяць на "Славянскім базары ў Віцебску", вылучаецца сваёй маштабнасцю, разнастайнасцю фарматаў Дзень Саюзнай дзяржавы. На гэты раз яго праграма пачалася ўранні: адкрываліся ўнікальныя, проста "залатыя" выставы "Торжок — живая традиция золотого шитья" і "Золотая хохлома — душа России". Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх імпрэзах і пры тым заўважыў: працоўны рытм Дня быў такім жа гарачым, як і надвор'е ў Віцебску. Адзначым, што ў рамках канферэнцыі "Молодежь — за Союзное государство" прайшоў зацікаўлены адкрыты дыялог Дзмітрыя Мезенцава і дэпутатаў Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі з прадстаўнікамі моладзевых арганізацый дзвюх краін. Юбілею фестывалю былі прысвечаны й круглы стол "Славянскі базар: 30 гадоў. Поспехі і перспектывы". Дзяржаўны сакратар прэзентаваў кнігу пра гісторыю фестывалю, выдадзеную пры падтрымцы Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы. А ўвечары быў вялікі святочны канцэрт "Союзное государство приглашает..." з удзелам вядомых беларускіх і расійскіх артыстаў. Дарэчы, адкрываючы імпрэзу, Дзмітрый Мезенцаў паабяцаў, што ў наступным годзе "будзем рыхтаваць не Дзень, а Дні Саюзнай дзяржавы".

Падрыхтаваў **Іван Ждановіч**

БЕЛТА



**Гледачы ў Летнім амфітэатры**

ДОСВЕД

## Карагоды творчасці на Самарскай зямлі

**Беларусы ў прыволжскім горадзе самі ладзяць цікавыя творчыя імпрэзы ды ўдзельнічаюць у тых, на якія іх запрашаюць**

***Фестываль-конкурс "На самарской волне"***

Яшчэ напрыканцы красавіка ў Доме культуры "Победа" гарадской акругі Самара прайшоў Гала-канцэрт абласнога міжнацыянальнага творчага фестывалю-конкурсу "На самарской волне". Ладзілі яго актывісты Самарскай абласной грамадскай арганізацыі беларусаў ды выхадцаў з Беларусі "Руска-Беларускае Братэрства 2000", прысвячаўся фестываль-конкурс-2021 святкаванню 170-годдзя Самарскай губерні. Праходзіў гэты творчы форум з 15 сакавіка па 25 красавіка пры падтрымцы Адміністрацыі гарадской акругі Самара, абласнога Дома дружбы народаў, нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў вобласці й гарадской акругі.

Адборачны тур фестывалю з-за кавідных абмежаванняў праводзіўся ў дыстанцыйным фармаце: па відэазапісах нумароў. На разгляд журы паступіла звыш 1000 конкурсных нумароў у розных намінацыях. У конкурсную плынь уліліся творчыя калектывы й салісты ад нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў, дзіцячых музычных, харэаграфічных школ, школ мастацтваў, музычных, харэаграфічных вучылішчаў, каледжаў, ВНУ; харэаграфічных, вакальных студый; дзяржаўных і недзяржаўных адукацыйных установаў ды ўстановаў дадатковай адукацыі Самарскай вобласці. Урэшце ж было адабрана 20 лепшых нумароў, якія ўвайшлі ў праграму Гала-канцэрта лаўрэатаў творчага фестывалю-конкурсу.

→ Стар. 4



**На фестывальнай сцэне — беларускі вакальны ансамбль "Каданс"**

ISSN 0439-3619
9 770439 361003 21007

ВАРТАВЫЯ ПАМЯЦІ

# Паклон зямны і медалі

## У крымскім горадзе Еўпаторыі да Дня Незалежнасці Беларусі некаторыя з ветэранаў-удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны атрымалі беларускія медалі

Штогод 3 ліпеня Рэспубліка Беларусь адзначае і Дзень Вызвалення, і Дзень Незалежнасці. Таму гэты святочны час выбралі мы, каб урачыста ўручыць юбілейныя медалі "75 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" некаторым з ветэранаў-еўпатарыйцаў, якія прымалі ўдзел у вызваленні Беларусі. Па розных прычынах не маглі зрабіць тое раней. Але, як кажуць, узнагароды знайшлі герояў. Перад тым я склала і дасылала, як кіраўніца мясцовай Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Крым — Беларусь", вывераны спіс ветэранаў Паслу Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Сямашку. З Масквы, праз кіраўніка аддзялення Пасольства ў Ростове-на-Доне Дзяніса Цімохіна, дайшлі да нас медалі для Аляксандра Касаткіна, Андрэя Дзікана, Аляксея Баннікава, Клаўдзіі Салаўцовай, Кацярыны Сяменчанкі, а таксама Рыгора Васільева (медаль яму ўручылі ўжо раней, гл.: ""Букет дружбы" для Рыгора Васільева" — ГР, 26.04. 2021).



Медаль для Кацярыны Сяменчанкі

Усім ім ужо за 90, аднак, наведаўшы іх, адзначаю: ветэраны не страцілі цікавасці да жыцця, збераглі-захавалі ўспаміны пра Беларусь часоў вайны. Маюць вялікую патрэбу ў зносінах, суперажыванні. Мы паспелі пагаварыць з імі пра вайну і мір, жыццё і смерць. Яны згадвалі таварышаў, якія загінулі ў баях, з пачуццём непераадольнага болю — нібы толькі ўчора тое было. Ва ўспамінах вярталіся ў мінулае, дзе ўсе яшчэ жывыя, але ідзе вайна і ніхто не ведае, што каму суджана. З пякучай шчырасцю распавядалі, што перажылі на фронце, у партызанах, што захавала памяць праз дзясяткі гадоў. Бывала, і паўтаралі адно і тое ж — каб данесці мне сваю праўду пра вайну. Дзякуй вам, дарагія ветэраны, і наш паклон зямны! Вы на той вайне назаўсёды будзеце маладымі, хоць сёння кожны ўжо на шляху да 100-гадовага рубяжа. Жадаем вам здароўя, бадзёрасці духа, каб з годнасцю яго ўзяць, адзначыць і 80-годдзе Вызвалення Беларусі.

Са мной да ветэранаў у святочны дзень наведваўся і Пётр Пудаў: капітан у адстаўцы, былы ліквідатар наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, наш супляменнік, сябар беларускай суполкі, сын ветэрана-вызваліцеля Бацькаўшчыны. Пра яго бацьку, Пятра Дзмітрыевіча Пудава, іншых ветэранаў, якія ўжо сышлі ад нас, мы згадвалі ў тэксце "Ветэраны родныя мае" (ГР, 15.02. 2020).

Калі ўручалі медаль Кацярыне Іванаўне Сяменчанцы (Бадуновай), былая партызанка загаварыла: вось бы запісаць военныя ўспаміны. І я паабяцала ў тым дапамагчы. Была яна ў партызанскім атрадзе імя Суворава, у лясах Браншчыны, які дзейнічаў і на беларускай тэрыторыі. Мела раненне, была эвакуяваная самалётам на Вялікую зямлю, выхоўвалася ў дзіцячым доме. Варта б сістэматызаваць і дакументы, што зберагаюцца ў ветэранкі — а многія з іх маюць гістарычную каштоўнасць.

Клаўдзія Салаўцова сустракала нас на балконе першага паверха, яе кватэра — у доме ў цэнтры Еўпаторыі. Стаяла, вітала з усмешкай і ў добрым настроі, з баявымі ды юбілейнымі ўзнагародамі на грудзях. Дзверы адчыніў яе ўнук Дзяніс. Ветэранка проста ўзрушыла нас рапартам на адным дыханні: "Першы Беларускі фронт, 1079 зенітны полк, камандуючы фронтам маршал Ракасоўскі!". Мы ўручылі ёй юбілейны медаль. Святло, спакой і задавальненне бачыла я ў абліччы, вачах жанчыны. Нарадзілася яна ў Валгаградскай вобласці, сяле Данілаўка, у 41-м закончыла школу. Працавала на абаронным заводзе, а 12 мая 1943-га пайшла добраахвотніцай на фронт. Служыла тэлефаністкай, а пры вызваленні Беларусі была наводчыцай у 1079 зенітна-артылерыйскім палку. Пасля вайны закончыла курсы медсясцёр ды на ўсё жыццё абрала гэту нялёгкую працу. Доўгі час працавала ў еўпатарыйскім санаторыі імя І. А. Нагавіцына (яго спецыялізацыя — лячэнне органаў зроку) у Еўпаторыі, аддавала цяпло сваёй душы людзям. Сёлета 12 жніўня Клаўдзіі Іванаўне Салаўцовай споўніцца 98 гадоў. І мы, актывісты суполкі "Крым — Беларусь", плануем прыйсці да яе з кветкамі, падарункамі, беларускімі песнямі.



У гасцях у Клаўдзіі Салаўцовай

Павага да ветэранаў, эстафета подзвігу, цяпло чалавечых зносін і філасофскае memento mori... Вельмі шмат, і самых розных эмоцый, пачуццяў, роздумаў выклікаюць такія сустрэчы! А пачуццё патрыятызму закладзена і актывізавана было ў нас, пасляваенных, нашымі бацькамі, якія пераможцамі вярнуліся з вайны. Дзякуй і Айчыне за тое, што ўмеем адрозніваць мы ў жыцці каштоўнасці сапраўдныя ад пустых бразгушак-бліскушак, якіх у свеце шмат. І любоў да зямлі бацькоў, і раўненне на подзвігі нашых папярэднікаў — гэта ж і ёсць тая беларуская самасвядомасць, што дапамагае нам выстаяць у любых жыццёвых выпрабаваннях, і ў грамадскай рабоце на карысць Бацькаўшчыны — таксама. Хоць і ўдалечыні ад яе. Але ж адлегласці — не перашкода для сапраўднай любові. Нядаўна ў сацсетцы "Одноклассники" мы, аднакурсніцы па факультэце журналістыкі БДУ, гаварылі пра тое: Леаніла Кароль (Масюк) з Іванава (Брэстчына), Тацяна Бялюк з Гродна, Ніна Пісарэнка (Дзюбкова) з Віцебска. Успомнілі нават, што на ўступных іспытах на пачатку 80-х пісалі сачыненне "Крэпасць над Бугам". На подзвігі, на герояў раўняемся й цяпер ды па-ранейшаму моцна любім Беларусь. Вось таму з ветэранамі мы — родныя душы, блізкія людзі.

**Дзіна Шаўчэнка**,
кіраўніца суполкі "Крым — Беларусь",
г. Еўпаторыя

**Дарэчы.** Дзіна Шаўчэнка паведаміла ў рэдакцыю, што 22 чэрвеня ў Еўпаторыі прайшоў мітынг-рэквіем, на якім быў адкрыты Памятны знак воінам-пагранічнікам — у гонар ваеннаслужачых розных пакаленняў, якія абаранялі рубяжы роднай зямлі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел беларусы горада. Эстафета патрыятызму прадаўжаецца.

КРЭАТЫЎНА!

## Роднай Беларусі — з любоўю

**Да Дня Незалежнасці Беларусі 2 ліпеня адкрылася выстава дзіцячых малюнкаў "Беларусі з любоўю!" Яна экспануецца прама ў вокнах Даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры.**

Штогод мы, беларусы Даўгаўпілса, праводзім імпрэзы, прысвечаныя галоўнаму дзяржаўнаму святу нашай Бацькаўшчыны. 3 ліпеня Рэспубліка Беларусь святкуе Дзень Незалежнасці. У розныя гады мы ладзілі да свята канцэрты, выставы, конкурсы дзіцячых малюнкаў, вечары ўспамінаў, быў нават флэшмоб. А на гэты раз кавідныя абмежаванні ўнеслі свае карэктывы, і нам давялося адмовіцца ад імпрэзы з удзелам артыстаў і гледачоў. Затое мы адкрылі новы, і па-свойму святочны фармат: зрабілі выставу дзіцячых малюнкаў прама ў вокнах Беларускага дома.

"Беларусі з любоўю!" — гэта экспазіцыя работ школьнікаў і выхаванцаў беларускай нядзельнай школы "Вясёлка" з фондаў ЦБК і Беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Уздым". Убачыць іх можа кожны, хто праходзіць па вуліцы Алеяс. І заадно нібы паглядзець на Беларусь вачыма дзяцей. А на іх малюнках бачым першародную прыроду, бабуліну хату, беларускіх бусла, зубра і васілёк. Ёсць таксама гістарычныя аб'екты, народныя касцюмы, дзяржаўныя сімвалы і нават знаёмая з дзяцінства згушчонка.

На адкрыцці выставы ў ЦБК прысутнічаў Генеральны консул Беларусі ў Даўгаўпілсе Ілья Лапуць. Ён адзначыў пазадальную ролю культуры ў дачыненнях народаў і краін. Кіраўніца ЦБК і "Уздыма" Жанна Раманоўская ад імя беларусаў Даўгаўпілса павіншавала беларускіх дыпламатаў з Днём Незалежнасці, пажадала міру, росквіту і дабрабыту Беларусі.

Выстава будзе працаваць у Цэнтры беларускай культуры да канца месяца. А на перспектыву мы мяркуем выкарыстоўваць падобны фармат у сваёй дзейнасці.

**Марыя Памецька**,
метадыстка Цэнтра беларускай культуры,
г. Даўгаўпілс

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Трафім загінуў пад Ржэвам

**Імя ўраджэнца Магілёўшчыны, з вёскі Нізкі Касцюковіцкага раёна, які прапаў без вестак на вайне ў 1943-м, вярнулася з небыцця. Расійскім пошукавікам сёлета ўдалося ўстанавіць месца яго гібелі.**

Салдацкі медальён, які дапамог ідэнтыфікаваць імя загінулага, знайшлі ўвесну пошукавікі з Бранскага ўпраўлення АТ "Транснефть — Дружба" ў часе міжнароднай ваенна-гістарычнай экспедыцыі "Ржев. Калининский фронт" у Цвярской вобласці. Знайшліся й гільзы, каска, кацялок, сапёрная рыдлёўка, кружка ды іншыя рэчы салдата. Эксперту лабараторыі "Солдатский медальон" Алегу Гусеву ўдалося ўстанавіць: рэчы належалі ўраджэнцу вёскі Нізкі Трафіму Макееву. На фронт яго прызвалі ў 1941-м, калі юнаку было ўсяго 18 гадоў.

15 чэрвеня на расійска-беларускай мяжы прайшла цырымонія перадачы асабістых рэчаў чырвонаармейца Трафіма Макеева родным, якія жывуць у Касцюковічах. У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі дэпартамента ўнутранай палітыкі Бранскай вобласці, Касцюковіцкага і Суражскага раёнаў, супрацоўнікі й ветэраны пагранупраўлення ФСБ Расіі па Бранскай вобласці, пляменніца салдата Ларыса Раманава (у дзявоцтве Макеева) з Касцюковіч, пошукавікі, школьнікі. У часе цырымоніі гаварылі пра велізарныя ахвяры, якія сабрала Вялікая Айчынная вайна. Была яна тады агульнай і для рускіх, і для беларусаў, і для ўсіх іншых народаў Савецкага Саюза. Гучалі ваенна-патрыятычныя песні, памяць загінулых салдат ушанавалі Мінутай маўчання.



Ларыса Раманава прымае рэчы загінулага дзядзькі

Школьнікі Расіі ды Беларусі абмяняліся малюнкамі на ваенную тэматыку, і выставы тых малюнкаў узяліся зладзіць памежнікі братніх дзяржаў. У памяць пра загінулых герояў прагучаў трохразовы залп. (Пра падзею напісалі й нашы калегі з беларускай газеты "Рэспубліка", гл.: "Герой возвратился с войны" — 17.06.2021. — **Рэд.**).

Кіраўнік пошукавага атрада "Транснефть — Дружба" Ігар Пятроў распавёў, што парэшткі чырвонаармейца Трафіма Макеева былі выяўленыя пры сяле Палуніна. Як і парэшткі 400 іншых чырвонаармейцаў, знойдзеных сёлета, іх пахавалі 22 чэрвеня на Ржэўскім Мемарыяле Савецкаму салдату. (Баі за Палуніна, вышыню 200 пры вёсцы ў вайну былі асабліва крывавымі, доўжыліся амаль месяц, вёска — за 5 кіламетраў ад Ржэва.— **Рэд.**)

**Рыгор Кажурын**,
журналіст, намеснік старшыні
Беларускага зямляцтва на Браншчыне

НА СУВЯЗІ — УКРАІНА

# Святочная выстава ў Мікалаеве

## Актывісты суполкі "Голас Радзімы" з вядомага ўкраінскага горада суднабудаўнікоў зладзілі кніжную выставу "Мой родны кут, як ты мне мілы!", прысвечаную Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь


Удзельніцы святочнай прэзентацыі


І газета "Голас Радзімы" ёсць у экспазіцыі


Таццяна Дзяменнікава і Канстанцін Картузаў

Велізарны рэсурс народнай дыпламатыі па-ранейшаму рэалізуюць на карысць братніх народаў Беларусі ды Украіны актывісты Мікалаеўскага абласнога нацыянальна-культурнага таварыства беларусаў "Голас Радзімы". У мінулым нумары мы падалі тэкст "Памятаем пра свае вытокі" (ГР, 21.06.2021) — пра чарговую творчую імпрэзу супляменнікаў, што ладзілася ў Мікалаеўскім каледжы культуры й мастацтваў. І атрымалі ўдзячнае пісьмо ад кіраўніцы суполкі Таццяны Дзяменнікавай. Тады ж яна з намесніцай, Таццянай Бусько, збіралася ў Кіеў. Запрасіла іх ва ўкраінскую сталіцу Амбасада Беларусі: 24 чэрвеня там ладзілася ўрачыстасць у гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Інфармацыя, прыгожыя здымкі з яе ёсць на сайце Амбасады. І ўжо наступным днём абедзьве Таццяны зноў былі ў Мікалаеве. Як піша Дзяменнікава, трапілі з карабля на баль: прэзентавалі разам з іншымі сябрамі суполкі да Дня Незалежнасці кніжную выставу "Мой родны кут, як ты мне мілы!". Працавала выстава ў Навукова-педагагічнай бібліятэцы горада Мікалаева, і ладзілася дзеля таго, каб "знаёміць жыхароў Мікалаева й Мікалаеўшчыны з культурай, мовай, традыцыямі беларускага народа". І я б яшчэ дадаў: каб засведчыць у чарговы раз, што нягледзячы на розныя перамены ў палітычным клімаце, у дачыненнях паміж нашымі краінамі беларусы ды ўкраінцы застаюцца роднымі, блізкімі людзьмі, народы нашы маюць багатую агульную гісторыю і культуру, моцныя повязі добрасуседства.


Выставачныя стэнды з сурвэткамі

Заслугоўвае павагі, што беларусы Мікалаева ў сваёй працы актыўна скарыстоўваюць магчымасці сучаснай інтэрнэтпрасторы. І таму можна пабачыць і ў сацсетках, на іншых рэсурсах відэазапісы з прэзентацыі выставы. Асноўную мелодыю, як бачым, разам з вядучай Таццянай Дзяменнікавай вядзе на прэзентацыі спявачка Валянціна Каракіна. Цудоўна, душэўна гучаць у яе выкананні папулярныя беларускія песні. У сцэнар адкрыцця выставы гожа ўпісаліся й вершы беларускіх паэтаў пра Радзіму — іх чыталі Таццяна Дзяменнікава, яе паплечніцы Таццяна Бусько, Валянціна Джупіна. Дапамагалі ж ім у творчай працы, як заўсёды на падобных імпрэзах, Ірына Русіна і Тамара Бусько — дачка Таццяны.

Што да выставы, то на ёй, паведамляе Таццяна Дзяменнікава, прадстаўлены кнігі, творы вядомых, прызнаных беларускіх паэтаў і празаікаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Янкі Маўра ды іншых. Бібліятэчныя стэнды, адзначым, прыгожваюць вышываныя беларускімі ўзорамі, арнаментамі сурвэткі ды ручнікі. Між тым і творам украінскага Кабзара Тараса Шаўчэнкі, перакладзеным на беларускую мову, знайшлося месца на выставе. Наведнікі бібліятэкі з цікавасцю гарталі кнігі пра гарады Беларусі, пра культуру, традыцыі, беларускую кухню. Дзяцей вабілі беларускія народныя казкі, школьныя падручнікі. Як заўсёды, упрыгожваюць выставачныя стэнды мікалаеўскай суполкі нумары газета Выдавецкага дома "Звязда" "Голас Радзімы" (дасылаецца сябрам па пошце) ды іншыя выданні на беларускай мове. Дарэчы, і дырэктар бібліятэкі Канстанцін Картузаў (яго відэаматэрыялы з прэзентацыі ёсць у інтэрнэце) атрымаў па ходзе імпрэзы каштоўны падарунак ад Амбасады Беларусі ва Украіне: кнігі на беларускай мове.

У допісе ў рэдакцыю Таццяна Дзяменнікава ад імя ўсяго Мікалаеўскага абласнога нацыянальна-культурнага таварыства беларусаў "Голас Радзімы" выказвае шчырую падзяку кіраўніцтву і супрацоўнікам Навукова-педагагічнай бібліятэкі Мікалаева — за дапамогу, за падтрымку, за плённую творчую супрацу ў часе падрыхтоўкі й прэзентацыі кніжнае выставы "Мой родны кут, як ты мне мілы!".

**Іван Ждановіч**

СУПОЛЬНАСЦЬ

# Прыгожыя кветкі з розных лугоў

**На чарговым пасяджэнні Кансультатыўнага міжэтнічнага савета, які працуе пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, падвялі вынікі працы за год і аднагалосна пераабралі Георгія Егіазарана старшынёй**

У Беларусі на 1 студзеня 2021 года было афіцыйна зарэгістравана 205 грамадскіх аб'яднанняў ды іх аргструктур 25-і нацыянальных супольнасцяў. Для таго, каб каардынаваць іх працу, і створаны Кансультатыўны міжэтнічны савет. Старшынёй яго зноў абраны Георгій Егіазаран (ён да таго ж узначальвае Мінскае гарадское армянскае культурна-асветніцкае таварыства "Айастан"), яго намесніцай — Кімі Ры, кіраўніца Асацыяцыі беларускіх карэйцаў. Абавязкі адказнага сакратара, як і раней, будзе выконваць Эльвіра Ляўшэвіч, кіраўніца Міжнароднага грамадскага аб'яднання "Татара-башкірская культурная спадчына «Чышма»".

Георгій Егіазаран, які жыве ў Беларусі з 1979 года, — нязменны старшыня Кансультатыўнага міжэтнічнага савета з 2006-га, ад самага пачатку яго ўтварэння. Георгій Анушаванавіч, як ніхто іншы, ведае пра жыццё ва ўсіх нацыянальных грамадскіх арганізацыях, кіраўнікі якіх уваходзяць у савет. Пад яго старшынствам кіраўнікі суполак карэйцаў, татараў і башкіраў, чувашоў, дагестанцаў, азербайджанцаў, яўрэяў, малдаван, украінцаў, грэкаў, туркменаў, цыган, літоўцаў, рускіх, палякаў, эстонцаў, грузін, афганцаў, палесцінцаў, казахаў, немцаў збіраюцца разам, каб ладзіць агульныя праекты, дзяліцца досведам, быць у курсе спраў адзін аднаго.

Прадстаўнікі розных нацыянальных дыяспар жывуць на беларускай зямлі мірна і ў згодзе. Ім тут не забараняецца вывучаць родную мову і размаўляць на ёй, развіваць сваю культуру. Наша дзяржава ў тым па меры магчымасці дапамагае суполкам. Летась, напрыклад, за лік сродкаў Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, выдзеленых на гэтыя мэты з рэспубліканскага бюджэта, у рамках падпраграмы "Спадчына" Дзяржпраграмы "Культура Беларусі" на 2016-2020 гады былі выраблены й перададзены нацыянальным сцэнічныя касцюмы, а таксама музінструменты для творчых калектываў армянскага, чувашскага, малдаўскага, туркменскага, татара-башкірскага, грузінскага, грэчаскага, карэйскага, польскага, цыганскага й палесцінскага нацыянальна-культурных аб'яднанняў, выдадзены буклеты пра жыццё прадстаўнікоў армянскай і грузінскай дыяспар. Кіраўнікі яшчэ некалькіх нацыянальных суполак атрымалі новыя сцэнічныя касцюмы ў часе пасяджэння савета, з рук Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандра Румака.

Такім падарункам у суполках вельмі рады: іх творчыя калектывы актыўна ўдзельнічаюць у розных фестывалях і канцэртах. Сёлета, нягледзячы на абмежаванні з-за каранавіруса, яны выступалі на канцэрце, прысвечаным 30-годдзю СНД, далі канцэрт для маленькіх пацыентаў Рэспубліканскага рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў, паказалі свае таленты на Дні Расіі ў Верхнім горадзе ў Мінску. Дарэчы, пасля некаторага перапынку ў Верхні горад вяртаюцца й Дні нацыянальных культур: хутка, у жніўні пройдзе Дзень малдаўскай культуры. А на Дзень горада ў Мінску плануецца ўрачыстае адкрыццё XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. У часе фестывалю, як звычайна, пройдзе конкурсны адбор салістаў і творчых калектываў нацыянальных суполак па ўсёй Беларусі — лепшыя з іх змогуць патрапіць у наступным годзе ў Гродна: на ўрачыстае закрыццё фестывалю.

Традыцыйную акцыю "Тыдзень леса", у якой штогод удзельнічаюць актывісты розных дыяспар, яны прысвяцілі сёлета Году народнага адзінства. Ужо ў 14-ы раз прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў садзілі сосны, прадаўжаючы супрацу з Валожынскім лясгасам. Такія талокі, дарэчы, і прыклад іншым у беражлівым стаўленні да лесу, і клопат пра будучыню, росквіт беларускай зямлі.


**Аляксандр Румак і Георгій Егіазаран**

Напрыканцы Кансультатыўнага міжэтнічнага савета яго ўдзельнікам прадставілі новага калегу: Аляксандра Сангіна. У сакавіку Аляксандр Генрыхавіч быў абраны новым старшынёй грамадскага аб'яднання "Саюз палякаў на Беларусі" — на X справаздачна-выбарчым з'ездзе СПБ. Ён змяніў на гэтай пасадзе Мечыслава Лысага.

На сённяшні дзень у складзе Савета 21 чалец: кожны прадстаўляе нацыянальна-культурныя грамадскія аб'яднанні ды іх саюзы, зарэгістраваныя ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі. А між нацыянальнымі суполкамі даўно склаліся творчыя, сяброўскія стасункі.

**Ганна Лагун**

ДОСВЕД

# Карагоды творчасці на Самарскай зямлі

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Перад пачаткам канцэрта, як і мінулыя разы, госці свята знаёміліся з выставай нацыянальных галаўных убораў народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у вобласці, мелі магчымасць сфатаграфавацца ў іх на памяць. Арганізатараў, гледачоў і ўдзельнікаў Гала-канцэрта віталі ганаровыя госці: прадстаўнікі Адміністрацыі гарадской акругі, Дома дружбы народаў, кіраўнікі нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў вобласці. А святочную праграму песняй "Самарская Губерния" адкрыў шматразовы лаўрэат міжнародных, усерасійскіх конкурсаў-фестываляў мастацтваў беларускі вакальны ансамбль "Каданс" (мастацкая кіраўніца Іна Сухачэўская). Гурт, нагадаю, дзейнічае пры суполцы "Руска-Беларускае Братэрства 2000". Пазней у выкананні "Каданса" гучала й знакамітая беларуская "Лявоніха". У канцэрце паўдзельнічалі калектывы, салісты з армянскага, нямецкага, татарскага, украінскага грамадскіх аб'яднанняў вобласці, са школ, творчых дзіцячых устаноў, цэнтраў пазашкольнай працы Самары.

Па завяршэнні Гала-канцэрта было ўрачыстае ўшанаванне лаўрэатаў і пераможцаў фестывалю-конкурсу "На самарской волне". Цырымонію правялі старшыня журы, лаўрэат Губернскай прэміі ў галіне культуры й мастацтва, член Савета па міжнацыянальных адносінах пры Губернатары вобласці, прэзідэнт суполкі "Руска-Беларускае Братэрства 2000" Ірына Глуская і член журы фестывалю, шматразовы лаўрэат міжнародных і ўсерасійскіх конкурсаў-фестываляў мастацтваў, дырэктар суполкі Андрэй Кірылюк. Пры тым Ірына Глуская адзначыла, што міжнацыянальныя імпрэзы важныя для ўмацавання дружбы паміж народамі, усімі этнічнымі супольнасцямі, якія зберагаюць і развіваюць нацыянальную культуру на Самарскай зямлі, для творчых кантактаў, для развіцця духоўных сувязяў між людзьмі розных пакаленняў. Ад імя актыву суполкі "Руска-Беларускае Братэрства 2000" Ірына Міхайлаўна падзякавала Адміністрацыі гарадской акругі Самара, кіраўніцтву Дома дружбы народаў, кіраўнікам нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў вобласці ды гарадской акругі за падтрымку ініцыятыў самарскіх беларусаў па правядзенні падобных імпрэзаў.



**Удзельнікі Гала-канцэрта фестывалю-конкурсу "На самарской волне". Фота на памяць.**

***Беларускія кветкі ў славянскім вянку***

Па добрай традыцыі дзве самарскія абласныя славянскія суполкі, беларуская ды ўкраінская, сумесна паўдзельнічалі ў міжмуніцыпальным свяце рускай народнай культуры "Русская берёзка". Свята — штогадовае, праходзіла 20 чэрвеня 2021 года ў маляўнічым месцы пры рацэ Вялікі Кінэль у раёне Кандарыхінага гаю ля сельскага паселішча Кінэль-Чаркасы. Свята вядзе гісторыю на тэрыторыі раёна з 2014 года, прымеркавана да Святой Тройцы, і ў ім гарманічна сышліся праваслаўныя традыцыі з народнымі вераваннямі, звычаямі славян. Сімвалам свята стала бярозка. Нашы продкі лічылі, што яна валодае асаблівай сілай росту, якую трэба скарыстоўваць у побыце. Галінкі бярозавыя спрадвеку выкарыстоўвалі як своеасаблівы абярэг ад усялякай нячыстай сілы.

Як адзначае Ірына Глуская, суполка "Руска-Беларускае Братэрства 2000" і Рэгіянальная грамадская арганізацыя "Украінскі нацыянальна-культурны цэнтр "Промінь" ("Луч") заўсёды ў творчай супрацы і разам удзельнічаюць у свяце "Русская берёзка". Якое, дарэчы, уключана ў праграму рэгіянальнага творчага праекта "Культурное сердце России". Свята паспрыяла пашырэнню ўзаемадзеяння суполак. Андрэй Шчобак, кіраўнік цэнтра "Промінь" ("Луч"), у прыватнасці, згадвае: украінскі вакальны гурт "Чаровницы" прапанаваў беларускім вакальным ансамблям запісаць як відэаролік выкананне песні "Гімн славян".



У сёлетняй святочнай праграме было 12 інтэрактыўных пляцовак, шмат усяго цікавага. У свяце паўдзельнічаў вакальны ансамбль "Сузор'е" (мастацкая кіраўніца Алена Кірылашава): ён выконваў беларускую народную песню "З-пад шэрага камушыка" ды карагодную "Гыля, гыля, гусі!", бадзёрую "Самаварчык", руския "Кадриль" ды "Золотая ярмарка". У конкурснай праграме на лепшае чытанне вершаў пра Радзіму, родны край, рускую бярозку беларускую суполку прадставіла Віталіна Панова (твор Усевалада Раждественскага "Берёза"). Гэтая ж дзяўчынка ды Вера Сальнікава, Тамара Цвяткова дэманстравалі рускія стылізаваныя касцюмы ў конкурсе на паляне "Русский костюм" — і былі адзначаны граматамі, каштоўнымі падарункамі ад Адміністрацыі Кінэль-Чаркаскага раёна. Таксама Віталіна ды Вера паспяхова паўдзельнічалі адпаведна ў конкурсах "Дзіцячая каса" ды "Дзявочая каса", за што атрымалі ўзнагароды, падарункі. Ну й карагодна-абрадавае дзеянне "В русский хоровод собираем весь народ!" ды вялікі агульны карагод "Во поле березка стояла" не абышліся без украінскіх ды беларускіх удзельнікаў свята.



**Спявачкі з вакальнага ансамбля "Сузор'е"**

**Мікалай Бойка**, г. Самара.
Фота з архіва САГА «Руска-Беларускае Братэрства 2000».

ДАЛЁКАЕ — БЛІЗКАЕ

# Папараць-кветка цвіце ў Зауралллі?

**У сяле Нова-Ільінскае Петухоўскага раёна Курганскай вобласці, якое ў 1853 годзе заснавалі беларусы, збераглася памяць пра Купальскія звычаі ды абрады**

Дзяўчынкі ў вянках з палявых кветак, звіванне вянкоў і нават дзве старэйшыя кіраўніцы дзеі ў гэтых Купальскіх уборах... І хораша глядзяцца дзяўчаты ў белым адзенні пры возеры! Фотаздымкі даслала ў рэдакцыю, пра водгулле даўніх традыцый у сяле напісала Людміла Урванцава, кіраўніца Нацыянальнага культурнага цэнтра беларусаў Зауралля "Батькавщина". Тэкст са здымкамі — відаць, паводле яе ж допісу — ёсць на партале ФНКА Беларусаў Расіі — гл. "Белорусы Зауралья отпраздновали Купалле". А зварот да Купальскіх традыцый у сяле Новае Ільінскае (і так яго называюць) не выпадковы. У артыкулах "Сяброўства зямляцкае сілы дае!" (ГР, 10.04.2014), "Агульныя карані зблiжаюць" (ГР, 18.09.2014) мы звярталі ўвагу, што заснавалі вёску (раней — Пруды, бо пры сажалцы-прудзе было) выхадцы з Віцебскай губерні, пераехалі яны ў Зауралле яшчэ ў 1853 годзе. З тых публікацый вынікае, што ў вёсцы жывуць нашчадкі тых беларусаў, некаторыя з іх цікавяцца традыцыямі продкаў. А звярнуцца да родных каранёў, адчуць повязі з беларускай культурай ім дапамагаюць актывісты курганскай суполкі "Батькавщина", аддзяленнем якой у сяле кіруе Аляксандр Цыбутаў.



**Арганізатары свята**

Мы ўдакладнілі, што Людміла Урванцава даслала вытрымкі з таго, што расказала й пісала пра сельскі побыт у Нова-Ільінскім Надзея Фёдараўна Лапухіна — яна працуе бібліятэкаркай у Новаільінскай бібліятэцы. А здымкі зрабіла Эльвіра Сяргееўна Багданава, кіраўніца мясцовага Дома культуры.

Цяпер трохі пра саму апошнюю падзею ў Новым Ільінскім. З допіса вынікае, што напярэдадні Івана Купалы (у Расіі так называюць свята) у сяле штогод ладзяцца паходы ў лес: па травы. Але паколькі сёлета — гарачыня, і пажаранебяспечная сітуацыя ў рэгіёне, то культработніцы сабралі дзяцей на дзіцячай пляцоўцы. Надзея Лапухіна і Эльвіра Багданава расказалі ім пра Купальскія традыцыі ды звычаі. Правялі майстар-клас "Абрадавы вянок". І ўвечары, па традыцыі, дзяўчаты апусцілі тыя вянкі на ваду.

Звернем увагу: язычніцкае Купалле ў Зауральскім беларускім сяле стала як бы другасным святам, нейкім прысвяткам — у параўнанні з хрысціянскім святам: днём святога Івана, ці Івана Купалы (у Беларусі кажуць і святога Яна, ёсць назва травы, што цвіце ў Купальскую пару: святаяннік — па-руску зверобой). Хоць і называецца ў допісе ноч з 6 на 7 ліпеня "чароўнай, паэтычнай, поўнай цудаў і загадак", але ж удакладняецца, што гэта "ноч напярэдадні аднаго з самых яркіх славянскіх святаў Івана Купала". Вось такі эфект дае "зрашчэнне" язычніцкіх і хрысціянскіх святаў. У Беларусі ж святкуюць менавіта Купалле. Далей у дасланым тэксце — апісанне гаданняў і прыкметаў, звязаных з вянкамі на вадзе. І ўсе яны, вядома ж, пра каханне ці замужжа, што для дзетак на здымках наўрад ці актуальна...



**Купальскаю парою над возерам Прудок**

І яшчэ цікавая дэталь. Як напісала Людміла Урванцава, у той час, як дзеткі забаўляліся з Купальскімі травамі, Аляксандр Цыбутаў з карэннымі жыхарамі, прадстаўнікамі старэйшага пакалення сяла правялі набажэнства: прасілі ў Бога дажджу на беразе возера Прудок. Меркавалася, пройдзе набажэнства і ў Іванаў дзень. Падкажам новаільінцам, што спрадвечную беларускую замову-песню-закліканне дажджу ў 2013-м спявала нам беларуска баба Лена (Алена Цімафееўна Шышова) з райцэнтра Вікулава Цюменьскай вобласці (падрабязней гл.: "Баба Лена і яе сяброўкі" — 6.03.2014). То можа й такая духоўная спадчына некаму спатрэбіцца? Бо галоўная ж ідэя сапраўднага Купалля — у тым, каб і сама Прырода нас чула, і мы яе. Так, можна й проста пазабаўляцца-пагуляць у кветачкі-вяночкі. А можна паспрабаваць згарманізаваць у лучнасці з ягонаю — Купальскаю, касмічнаю... — сілаю свой унутраны свет, і свае стасункі з людзьмі, Прыродай, Усявышнім.

**Іван Ждановіч**

# Купалле з працягам

Спачатку традыцыі Купалля ажылі для беларусаў Даўгаўпілса ды іх сяброў у адным з музейных дворыкаў горада. Потым дэлегацыя беларусаў Латвіі ўпершыню пабывала ў Купальскую пару і на Бацькаўшчыне: у Магілёве, пры Дняпры, у Александрыі.

**У музейным дворыку**

Купальская пара заўсёды насычаная падзеямі для беларусаў Даўгаўпілса. І рыхтуемся мы да вялікага народнага свята заўсёды загадзя. Вось і сёлета змаглі адзначыць яго належным чынам. 9 ліпеня 2021 года ў нас прайшоў святочны канцэрт "Беларускае Купалле": яго зладзілі супольна Даўгаўпілскі Цэнтр беларускай культуры



**Ох, і смачны Купальскі напой!**

(ЦБК), Упраўленне культуры Даўгаўпілскай гарадской думы і Даўгаўпілскі краязнаўчы й мастацкі музей. А прадаўжалася штогадовая Купальская традыцыя гэтым разам ва ўнутраным дворыку згаданага музея.

Усё там стварала непаўторную святочную атмасферу. Мы ўпрыгожылі сцэну ў Купальскіх матывах, выкарыстоўваючы адпаведную стылістыку. Было стылізаванае вогнішча перад ёй. Для гледачоў, гасцей імпрэзы падрыхтавалі сталы з майстар-класам — паказвалі, як складваць Купальскія букеты з лугавых траў, рабіць абярэгі з прыродных матэрыялаў. Быў на стале і чароўны Купальскі напой, згатаваны на травах ды з мёдам. Да таго ж ахвочыя маглі сфатаграфавацца ў Купальскім коле выканання жаданняў. І была гэта, дарэчы, першая ў гэтым годзе публічная імпрэза нашага цэнтра. Старт ёй далі кіраўніца ЦБК Жанна РамаНоўская і Генеральны консул Беларусі ў Даўгаўпілсе Ілья Лапуць: нагадалі ўсім пра сакральную сілу Купалля ды спалучаныя з ім народныя традыцыі беларусаў.

Ансамбль народнай песні "Купалінка" (мастацкі кіраўнік Вячаслаў Пятроў) беларускай карагоднай ды вясёлай латгальскай народнай песнямі задаў дынамічны тон святочнаму канцэрту. Танцавальны ансамбль "Лянок" (мастацкая кіраўніца Марына Медунецкая) гэтак станчыў "Польку", "Карапет" і "Канюшыну", што зайграла сцэна рэхам. Дзяўчаты з вакальнага ансамбля "Пралескі" (мастацкая кіраўніца Настасся Лукашэнак) вельмі кранальна спявалі Купальскія песні, да таго ж паказалі міні-дзею са звітымі з Купальскіх траў вяночкамі. А харавой капэле "Спадчына" (мастацкая кіраўніца Яніна Юзэфовіч) падпявалі, дружна пляскалі ўсе гледачы. Паэт Станіслаў Валодзька здзівіў незвычайным, прама "рэперскім" стылем прачытання верша "На Івана, на Купалу", я ж у ролі Зельніцы дзялілася сакрэтамі чароўных Купальскіх траў — і некаторыя гледачы пасля прасілі даць ім тых зёлкаў.



**Купальскі вянок яднае аднадумцаў**

Вядучыя "Беларускага Купалля" — Ясь (Уладзімір Стасевіч) ды Яніна (Алена Радзівонава) — гарманічна спалучалі святочныя нумары. Ірына Апэйнанэ й Дагнія Ліцвіноўская паклапаціліся пра тое, каб выконваліся меры бяспекі, звязаныя з каранавіруснай пандэміяй. А валанцёр Ілона Раманоўская шчодра частавала ўсіх духмянай гарбатай, дапамагала рабіць-майстраваць абярэгі. Адно слова: талака!

Вось у такім фармаце здолелі мы адсвяткаваць Купалле-2021. Ёсць вынік, ён атрымаўся вельмі станоўчы й пазітыўны, і гэта галоўнае. Цэнтр беларускай культуры выказвае словы падзякі за падтрымку Упраўленню культуры Даўгаўпілскай гарадской думы, Даўгаўпілскаму краязнаўчаму й мастацкаму музею, Паліцыі самакіравання. А таксама ўсім артыстам і гледачам, даўгаўпілскім і латвійскім СМІ, хто паспрыяў нашаму Купаллю, розгаласу пра яго. Мы радыя, што асвяцілася Купальскім агнём, і маем надзею на вяртанне ўсіх нашых імпрэзаў у звыклыя фарматы — без абмежаванняў.

**Марыя Памецька**, метадыстка Цэнтра беларускай культуры

**Беларусы Латвіі ў Александрыі**

***Сёлета здзейснілася цудоўная наша мара: амаль за два гады першая дэлегацыя суайчыннікаў з суседняй краіны трапіла ў Беларусь. З Рыгі, Даўгаўпілса, Ліепаі ды Екабпілса былі яны на свяце "Купалле" ў аграгарадку Александрыя: у Шклоўскім раёне Магілёўшчыны. Гэта, як вядома, самае грандыёзнае народнае свята ўлетку ў Беларусі. Мы ўсе чулі, што ў Купальскую пару здараюцца розныя дзівосы. І адным з іх, мяркуе Валерый Амбросаў з Даўгаўпілса, стала падарожжа латвійскіх беларусаў на Бацькаўшчыну.***

Купальскім цудам было тое, што патрапілі мы 10 чэрвеня ў Александрыю. Цяпер усюды ёсць абмежаванні з-за кавіду, і выехаць за мяжу — справа няпростая. Ініцыяваў паездку Генконсул Беларусі ў Даўгаўпілсе Ілья Лапуць. Дзякуючы ініцыятыве Ільі Віктаравіча мы й змаглі пабачыць на свае вочы незабыўны народны фэст.

Купалле пад дэвізам "Александрыя збірае сяброў" стала явай у 2010 годзе, з часам фэст набыў міжнароднае прызнанне, і летась прайшоў пад патранатам ЮНЕСКА. На сёлетнім фэсце асноўнай аб'яднальнай ідэяй стаў ручнік: ён сімвалізаваў адзінства народа Беларусі. А сёлета ж на Бацькаўшчыне — Год народнага адзінства.

Спыніліся мы ў Магілёве, а на фэст у Александрыю прыехалі на цягніку. Па дарозе з вакзала да месца святочных дзей змаглі ацаніць грандыёзны маштаб свята, пабачыць гурмы ягоных прыхільнікаў. Уздоўж Дняпра — сотні розных шатроў, намётаў, інфастэндаў. Тысячы і тысячы гасцей шпацыруюць між радоў, аглядаюць разнастайную прадукцыю, частуюцца як традыцыйнымі беларускімі стравамі на аснове бульбы (дранікі, калдуны, клёцкі...), так і піцай ды лазанняй — на аснове... бульбы.

На малой святочнай сцэне ідзе канцэрт у рэжыме "нонстоп". Усе радуюцца-весяляцца. З палаткі "Белпошты" кожны мог адправіць бясплатна тут жа выраблену паштоўку па ўсёй Беларусі.

Святочны пошум фэсту не сціхаў, калі пачаўся канцэрт на галоўнай сцэне. Святочную праграму адкрыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што свята ў Александрыі — добрая нагода сустрэцца з роднымі, сябрамі, аддаць даніну павагі звычаям і традыцыям продкаў. Тэма ж канцэрта як бы вяртала нас у часы, калі актуальнымі былі канцэрты па заяўках. На гіганцкай сцэне, абсталяванай вадкакрышталічнымі панэлямі, бачылі мы тых, хто змог выказаць свае пажаданні. Пасля канцэрта грымеў шыкоўны, працяглы салют, потым пачалася дыскатэка — усе танчылі пад папулярныя мелодыі мінулага й цяперашняга часу. І вярнуцца са свята было нескладана: цягнікі хадзілі да Магілёва ўсю ноч, ад вакзала курсіраваў грамадскі транспарт. Так што свята ў Александрыі пакінула самыя выдатныя і незабыўныя ўражанні.

**Валерый Амбросаў**, сябар праўлення Беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Уздым"

*"Традыцыі, якія пакінулі нам гэтыя слаўныя, мудрыя і моцныя людзі тысячу гадоў таму, фактычна сталі часткай нашай культуры, леглі ў аснову сучаснага ладу жыцця. У іх ёсць усё, што сёння паядноўвае нас, беларусаў, як народ. Гэта сакральныя веды аб прыродных стыхіях, гаючых травах і абярэгах. Веды, якія вучаць любіць прыроду, шанаваць яе дары і берагчы прыгажосць. Гэта сувязь язычніцкіх абрадаў і хрысціянскіх сімвалаў, якая стала асновай верацярпімасці і талерантнасці. Гэта вытокі нашай адданасці традыцыйным каштоўнасцям, галоўныя з якіх — сям'я, клопат пра дзяцей, павага да старэйшых пакаленняў. Вось адкуль наш характар, нашы звычаі, нашы традыцыі — адтуль, з глыбінь тысячагоддзяў".*

З выступлення **Аляксандра Лукашэнкі** на Купаллі ў Александрыі

***На Купальскім свяце пры Дняпры, на малой радзіме Прэзідэнта Беларусі пабывала ў ліку іншых і Лілія Воранава з Даўгаўпілса. Потым расказвала сябрам, што Купалле ў Александрыі нібы вяртае ўсіх нас да сваіх вытокаў.***

Ад Беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Уздым" мне пашчасціла пабываць у складзе дэлегацыі ад Латвіі (усяго было 11 чалавек) на свяце ў Александрыі. Маштабныя гулянні праходзяць штогод на беразе Дняпра і ля моста, які злучае Александрыю і Копысь, да таго ж Магілёўскую і Віцебскую вобласці. На шматлікіх сцэнах аднačасова ідуць канцэрты, розныя тэатралізаваныя прадстаўленні, конкурсы, выставы.

Мы самі пабачылі: Александрыя на Купалле сабрала столькі сяброў! А гэта ж лепшае сведчанне моцы й прыгажосці Бацькаўшчыны. Скажу шчыра: многа дзе я бывала, і на розных святах, але такой масавасці, непаўторнага каларыту, прыгажосці яшчэ не бачыла. Праграма фестывалю яднае ў сабе маштабную выставу народных дасягненняў, яркую канцэртную праграму і, вядома ж, старадаўнія традыцыі, якія даюць дзівосную падсветку і на творчасць майстроў, і на ўсю атмасферу свята, настрої гасцей.

Асэнсоўваючы, перажываючы ўбачанае, разважаю: як здорава, што ўсё гэта ёсць! Можна прыехаць — і акунуцца ў чыстыя крыніцы народнай творчасці. У наш час, калі знясільвае гонка за матэрыяльнымі дабротамі, калі падкочваецца бесперапынна шэраг праблем (часта й надуманых), так важна бывае сказаць сабе: "Хопіць!" І вярнуцца да сваіх вытокаў, прыехаць на зямлю, дзе зрабіў ты першыя крокі. Так проста гэта: праз успаміны з маленства, з усмешкай аглядаючы той беспурботны час — нібы памаладзець. Адчуць у душы гучанне Радасці. Гледзячы на ўсю гэтую прыгажосць, усведамляеш, наколькі багатая наша зямля талентамі. Гэта сапраўдныя



**Беларусы Латвіі ў Магілёве**

майстры, якія тэхналогіі ранейшыя збераглі, да таго ж перадаюць сваё ўмельства й веды маладзейшым. Так што ўсім раю фэст "Александрыя збірае сяброў" наведаць, а як будзеце там, то заставайцеся ў святочнай плыні як мага даўжэй, бо кульмінацыяй свята нязменна становіцца гала-канцэрт.

Нашы словы падзякі адрасуем Генеральнаму консульству Беларусі ў Даўгаўпілсе, якое зладзіла гэтую цудоўную паездку, і асабліва Генеральнаму консулу Ільі Лапуцю, які ў гэты праект уклаў часцінку сваёй вялікай душы.

**Лілія Воранава**, сяброўка праўлення таварыства "Уздым".
Фота аўтара.

# У “Купалінкі” гарачая пара

## Яркія ўражанні атрымліваюць артысты народнага ансамбля беларускай песні "Купалінка" з Тальяцці ў часе паездак, сустрэч, выступленняў у розных месцах Самарскай вобласці



Беларусы Расіі ў Брэсцкай крэпасці

Навін у беларусаў Тальяцці шмат, і большасць з іх спалучаны з актыўнай дзейнасцю ансамбля, які прыгожа прадстаўляе на розных пляцоўках Беларускую нацыянальна-культурную аўтаномію "Нёман". Пра тое, чым жывем, дзе пабывалі, будзе мой аповед.

**Паездка ў Беларусь**

Незабыўныя штораз нашыя паездкі ў Беларусь. Аднак у сувязі з кавіднымі абмежаваннямі здзейсніць запланаванае не ўдаецца. І ўсё ж пашанцавала салістцы "Купалінкі" Таццяне Касіравай. Ад суполкі "Нёман" па запрашэнні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Беларусаў Расіі была яна ў прадстаўнічай дэлегацыі актывістаў аўтаноміі, якая наведвала Брэсцкую крэпасць-герой 22 чэрвеня. У складзе дэлегацыі, расказвала Таццяна, сабраліся цікавыя людзі, актыўныя беларусы з розных рэгіёнаў Расіі. На чале з кіраўніком ФНКА Беларусаў Расіі Сяргеем Кандыбовічам яны праехалі па маршруце Масква — Мінск — Брэст — Мінск — Орша — Масква ў рамках праграмы "Свяшчэнную память храня обо всем, мы помним!". Дэлегацыя наведала Дзелавы і культурны цэнтр Пасольства Беларусі ў Расіі, храм святой велікамучаніцы Ірыны — там прайшло набажэнства, затым настаяльнік храма блаславіў усіх на паездку. Па дарозе да Мінска вандроўнікі ўсклалі кветкі на месцы гібелі Першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі, Героя Савецкага Саюза Пятра Машэрава, пабывалі пад Мінскам на Кургане Славы.

Дэлегацыя беларусаў Расіі была ў Брэсцкай крэпасці-героі, дзе ладзіліся памятныя мерапрыемствы з нагоды 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У Брэсце прайшлі рэканструкцыі гарадскога жыцця перадваеннай пары: на вуліцах горада і на тэрыторыі крэпасці. А раніцай 22 чэрвеня госці ўдзельнічалі ў мітынгу-рэквіеме.

У ходзе змястоўнай, прадуманай паездкі было шмат цікавых сустрэч, наведванняў месцаў воінскай славы, музеяў, храмаў. Прыкладам, дэлегацыя на зваротным шляху наведала Сабор Аляксандра Неўскага ў Кобрыне: ён узведзены пры месцы пахавання салдат, якія загінулі ў 1812 годзе ў часе змагання з арміяй Напалеона. У Свята-Богаяўленскім Куцеінскім мужчынскім манастыры дэлегацыю прымаў намеснік абіцелі айцец Ніл, прайшла экскурсія па тэрыторыі, музеі, што расказвае пра дзейнасць вядомай раней Куцеінскай друкарні асветніка Спірыдона Собаля — там друкаваліся адны з першых беларускіх буквароў.

На шляху беларусаў Расіі была і Хатынь, і мемарыял "За нашу Советскую Родину!" — яго наведвалі разам з навучэнцамі й педагогамі з Ваенна-патрыятычнага клуба ЮНЕСКА "Русичи", што дзейнічае ў Аршанскім дзяржаўным політэхнічным прафесійна-тэхнічным каледжы. А згаданы мемарыял адкрыты ў Оршы ў 1966-м: да 25-годдзя першага залпу баявой машыны БМ-13, вядомай пад імем "Катюша". У часе знаёмства з клубам "Русичи" першы намеснік старшыні, выканаўчы дырэктар ФНКА Беларусаў Расіі Аляксандр Даркові і першая намесніца старшыні ФНКА Аксана Солапава перадалі ў бібліятэку клуба некаторыя выданні аўтаноміі.

**А марафон прадаўжаецца**

Гаворка тут не пра спартыўнае спаборніцтва — пра марафон нацыянальных культур "Территория дружбы". Ён пачаўся з 21 мая ў Стаўрапальскім раёне Самарскай вобласці, доўжыцца да канца лета. Ініцыявалі, распрацавалі праект раённая бібліятэка (ёй кіруе Вольга Лысова) і Дом культуры (дырэктар Алеся Елкіна). Арганізатары й запрасілі ў марафон "Купалінку", прыкладна раз на тыдзень мы ў дарозе.

Першае выступленне ў нас было 18 чэрвеня ў сельскім пасяленні Луначарскі, дзе разам з мясцовымі жыхарамі мы згадвалі памятную дату: 80-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Святкавалі там і Дзень двара. Мясцовыя культработнікі — нашы сябры, партнёры, далучаюцца да нашых праектаў. Дзякуючы добрай абвестцы, афішам гледачоў сабралася шмат. Мы ўручылі вяскоўцам каравай, а ў бібліятэку падарылі кнігу пра Пятра Машэрава (яе дарылі потым і ў іншых пасяленнях). У часе творчай сустрэчы гаварылі пра вайну, гераічную абарону Брэсцкай крэпасці, а пасля нашай праграмы ўсе разам спявалі ваенныя песні, знакамітую "Кацюшу". А потым вяскоўцы прынеслі столік з пачастункамі — там і агурочкі маладыя, і мяса вэнджанае, і піца, бутэрброды, цукеркі... Мы ўсе дружна далучыліся да такога частавання — усім дваром. Асабліва спадабалася дзеткам: пачастункі на вуліцы, ды яшчэ і з беларусамі. Мы адчувалі сябе адной сям'ёй. Запрасілі яшчэ і ўвосень выступіць. Паедзем!

Выступленне ў Сасноўцы было тэматычна іншым, прысвячалася Дню Рэспублікі Беларусь. Жыхары былі ўражаны, мы бачылі, яркімі канцэртнымі нумарамі, касцюмамі, душэўнымі беларускімі песнямі. Мы адразу знайшлі кантакт з гледачамі, якія хвілін за 30 займалі месцы: з дзецьмі, унукамі на руках. Святочны настрой адчуваўся на ўсім. І на фота, што рабілі на памяць па "марафонскім маршруце", тое відаць. А далей было на ім сельскае пасяленне Рассвет. У якім загадчыца ДК Н. Рабава разам з унукам Арцёмам зрабілі для нас прыгожае сонейка. Уваход у клуб упрыгожылі шарамі, гучалі перад канцэртам беларускія мелодыі. Ну і нас прымалі з адкрытымі душамі: гледачы падпявалі, танцавалі разам з намі.



Сасноўка сустракае "Купалінку" з сонейкам

І чацвёртае пасяленне: Ягаднае. З кіраўніцай мясцовага Дома культуры К. Марозавай мы ў супрацы даўно. Помніцца, харэаграфічны ансамбль, якім яна кіруе, удзельнічаў у нашым святочным канцэрце да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Усмешкі, песні, апладысменты і святочны, пазітыўны настрой. Ва ўсіх чатырох пунктах сустракалі нас гасцінна, частавалі чаем з пірагамі й не толькі. Мы бачылі, адчувалі: нам у глыбінцы рады. Вялікі дзякуй Вользе Віктараўне ды Алесі Аляксандраўне за прадастаўлены транспарт, арганізацыю пляцовак, музсуправаджэння. У жніўні марафон прадоўжым, на чарзе — сельскія пасяленні Лапаціна, Прыморскі... Добрая пагалоска пра беларусаў Тальяцці пайшла па ўсіх ваколіцах.

**У школьным лагеры**

Гарачым выдаўся ў нас увесь чэрвень. Спачатку паўдзельнічалі ў святкаванні Дня горада Тальяцці, затым правялі Дзень дружбы ў дзіцячай бібліятэцы №12 ды распачалі марафон (пра тое напісала вышэй). То пра Дзень дружбы скажу колькі слоў — магчыма, наш досвед іншым спатрэбіцца.

Мы даўно практыкуем сустрэчы са школьнікамі. Гэта, паверце мне, вельмі ўдзячная аўдыторыя. І цікавасць да іншай краіны, народа ў ёй натуральная. Вось і задумалі мы правесці ў бібліятэцы Дзень дружбы для дзяцей з летняга школьнага лагера. На сустрэчы з імі расказвалі пра дружбу народаў Беларусі ды Расіі, пра тое, што ў Тальяцці жывуць беларусы, што ў нас ёсць свая суполка, творчыя гурты. І як наш ансамбль беларускай песні "Зорачкі" ды народны ансамбль "Купалінка" ездзілі ў Беларусь, выступалі там. Пра сустрэчы ў летнім лагеры для дзяцей ля беларускага горада Ваўкавыска. І як наведвалі ў Мінску Музей Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальную бібліятэку, потым Хатынь, Курган Славы. А ў Бабруйску — старую крэпасць. Правялі віктарыну са школьнікамі, прачыталі ім беларускую народную казку "Ад крадзенага не пасыцееш" ды паразважалі над ёй.

**Людміла Дзёміна**, старшыня праўлення суполкі "Нёман", мастацкая кіраўніца народнага ансамбля беларускай песні "Купалінка"

**СУПРАЦОЎНІЦТВА**

# Беларуска-кітайскі літаратурны праект

**Пандэмія не спыніла стасункі паміж беларускімі ды кітайскімі пісьменнікамі: у Пекіне завершана праца па перакладзе й падрыхтоўцы да выдання "Зборніка сучасных беларускіх твораў"**

У хуткім часе кніга пабачыць свет у Пекінскім выдавецтве турыстычнай адукацыі. "Мы ўдзячны беларускаму боку, найперш выдавецтву "Мастацкая літаратура" за падтрымку ў стасунках з пісьменнікамі, выбарам твораў для перакладу, — дзеліцца ўражаннямі па выніках складання калектыўнага зборніка доктар філалагічных навук спадарыня Чжан Хуэйцінь, якая прыклала шмат намаганняў для стварэння Цэнтра культуры Беларусі ў Другім Пекінскім дзяржуніверсітэце замежных моў. — Мы атрымалі асалоду, працуючы над падрыхтоўкай кнігі. Перакладчыкамі ўкладзеных у яе твораў выступілі, акрамя мяне, яшчэ і даследчыкі, філолагі Хань Сяое, Сінь Мэн.

На старонках "Зборніка сучасных беларускіх твораў" змешчаны апавяданні лаўрэата Літаратурнай прэміі "Залаты Купідон" (2009) Алеся Бадака, чыя творчасць адзначана Прэзідэнтам Беларусі высокімі дзяржузнагародамі: медалём Францыска Скарыны, ордэнам Францыска Скарыны, вершы лаўрэата Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі ў галіне мастацтва і культуры Віктара Шніпа, народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, паэта Леаніда Драньько-Майсюка, казкі лаўрэата Літаратурнай прэміі "Залаты Купідон", лаўрэата Прэміі Садружнасці Незалежных Дзяржаў "Зоркі Садружнасці" Алеся Карлюкевіча.

"Мы і надалей гатовыя супрацоўнічаць з беларускімі пісьменнікамі, — запэўнівае спадарыня Чжан Хуэйцінь. — Магчыма, прадоўжым працу з тым самым Пекінскім выдавецтвам турыстычнай літаратуры альбо будзем працаваць з разлікам на іншае аўтарытэтнае выдавецтва. Кітайцы хацелі б адкрываць Беларусь, знаёміцца з характарам беларусаў і па мастацкіх творах. Некалі, у 1950-1980-я гады, у Пекіне, іншых гарадах КНР былі выдадзены літаральна дзясяткі кніг беларускіх паэтаў, празаікаў — Аркадзя Куляшова, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Янкі Маўра, Кандрата Крапівы, Паўла Кавалёва, Уладзіміра Калесніка, Янкі Брыля, Алеся Адамовіча, Петруся Броўкі, Святланы Алексіевіч... Тую традыцыю варта б узнавіць на новым узроўні, прыцягнуўшы і кітайскіх перакладчыкаў, і кітайскіх даследчыкаў беларускай літаратуры. Дарэчы, за час існавання Беларусі як суверэннай дзяржавы шмат хто з кітайскіх студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў пабываў у Беларусі, пазнаёміўся з філалагічнымі факультэтамі беларускіх ВНУ. Відавочна, што трэба развіваць іх актыўнасці ў знаёмстве з беларускай мастацкай літаратурай як перакладчыкаў паэзіі, прозы, драматургіі, дзіцячай літаратуры, ды і публіцыстыкі таксама. Вось літаральна цяпер мы надзвычай уважліва знаёмімся з аповесцю беларускага празаіка Андрэя Федарэнкі "Шчарбаты талер". Спадзяюся на яе асобнае кніжнае выданне ў Паднябеснай у перакладзе на кітайскую мову".

**Сяргей Шычко**

# "Беларускай хаткі" неўміручы дух

**У мінскай "Беларускай хатцы", якая цяпер мае статус філіяла Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, адсвяткавалі юбілей. 30 гадоў таму яна стала музеем.**

Адкрыла дзверы для наведнікаў "хатка" 25 чэрвеня 1991-га: у тую пару адзначаўся 100-гадовы юбілей Максіма Багдановіча. Як вядома, самы малады класік беларускай літаратуры калісьці кватараваў у гэтым будынку, які належаў Саве Рэдзьку. Таму й сёння тут збіраюцца аматары багдановіцкай творчасці. Некаторыя з іх прыйшлі на "Беларускі вечар" у стылі легендарных вечарын-"суботнікаў" пачатку XX стагоддзя, каб адзначыць 30-годдзе адкрыцця музея. Сярод іх былі супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, да якога "Беларуская хатка" мае прамое дачыненне.

ЯН ХВЕДЧЫН



Гурт "Ліцьвіны" на святкаванні юбілею "Беларускай хаткі"

Былы дом Савы Рэдзькі, пакуль не стаў музеем, знаходзіўся на сваім гістарычным месцы ў Мінску па вуліцы Талстога, 14 (былая Малагеоргіеўская, 12а). Дом скранулі з падмурка й перанеслі метраў на сто, на вуліцу Рабкораўскую, 19, напярэдадні зімы 1986-га. Там у паўразбураным, нявызначаным стане будынак туліўся яшчэ з год. Сёння "Беларуская хатка" — адзін з помнікаў гісторыі ды культуры канца XIX — пачатку XX стагоддзя, які стаіць практычна ў цэнтры сталіцы, сярод сучасных высотак. Гэта адзіны ацалелы будынак у Мінску, па-сапраўднаму звязаны з імем Максіма Багдановіча, з імёнамі яго сяброў — актыўнымі дзеячамі беларускага клуба інтэлігенцыі: Змітрака Бядулі, Язэпа Лёсіка, Людвікі Сівіцкай (Зоські Верас), Аркадзя Смоліча, Уладзіслава Галубка ды іншых творчых асобаў. (Якія таксама кватаравалі ў доме Савы Рэдзькі.) Таму назва "Беларуская хатка" для музея ўзнікла невыпадкова. Так называлі клуб інтэлігенцыі пачатку XX стагоддзя, што калісьці збіраўся на Захар'еўскай, 18. І музею было наканавана ўжо ў нашым часе прадаўжаць традыцыі легендарнай "Беларускай хаткі", дзе па суботніх вечарах гучалі творы беларускіх пісьменнікаў, народныя спевы, музыка, дзе моладзь вучылася танцаваць і гуляла ў "пошту"...

Сёлета святочны настрой гасцям імпрэзы стваралі легендарны фальклорны гурт "Ліцьвіны" (пад кіраўніцтвам таго ж Уладзі Бярберава ён 30 гадоў таму выступаў на адкрыцці "Беларускай хаткі") ды гурт архаічных спеваў "Астроўна". Прадаўжаючы традыцыі клуба інтэлігенцыі, музей у дзень юбілею стаў пляцоўкай для выканання народных песняў пад дуду, скрыпку, ліру ды цымбалы. Гасцей "Беларускай хаткі" парадаваў неўміручы батлеечны спектакль. Яны маглі пазнаёміцца з выставай дзіцячых мастацкіх работ арт-майстэрні "Залатыя птах". На двары для гасцей свята былі зладжаны гульні, якія любілі й сябры Максіма Багдановіча. Згадалі й бежанскія сталоўкі часу Першай сусветнай вайны, адчыненыя калісь на Малагеоргіеўскай, 12а і па Захар'еўскай, 18, — і таму "Беларуская хатка" прапанавала гасцям на юбілей смачную кашу й духмяную гарбату з печывам. Гучалі творы літаратараў, што жылі ў доме Рэдзькі. Аматары традыцыйных беларускіх танцаў да самага вечара танцавалі пры "Беларускай хатцы" разам з капэлай "На таку".

**Ганна Лагун**

ТАЛЕНТЫ

# Даўні след на новым палатне

**Мастацкія творы Алесі Мятліцкай увасабляюцца ў рэальнасці з дапамогаю кроснаў і нітак — на мінскім прадпрыемстве "Скарбніца"**

Магчыма, і не ведаюць многія беларусы замежжа, у чарговы раз апранаючы святочныя беларускія строі на розныя імпрэзы, хто канкрэтна іх шыў, хто ткаў і вышываў тканіны для іх. А між тым не выключана, што нараджаліся ўборы дзякуючы спецыялістам з Навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў "Скарбніца". Якраз там ствараюць вырабы ручнога ткацтва ды прыгожае адзенне, максімальна блізкае да традыцыйнага. Распрацоўваюць узоры новай прадукцыі з улікам каштоўнага досведу продкаў дасведчаныя мастакі. Скажам, працы Алесі Мятліцкай, вядучай мастачкі "Скарбніцы", становяцца явай з дапамогай кроснаў і нітак. Яна прыйшла на прадпрыемства 7 гадоў таму. Паспела дэталёва распрацаваць эскізы, каб на высокім узроўні рэканструяваць некалькі традыцыйных беларускіх касцюмаў, а таксама вялікую колькасць старажытнай бялізны, пакрывалаў, пледаў, дыванкоў, стальніц, абрусоў, сурвэтак. Вось такія каштоўныя скарбы — творчы набытак мастачкі па ткацтве.

На прадпрыемстве, расказала мне Алеся, кожны год выпрацоўваецца аднаўленне адзін беларускі традыцыйны касцюм, і ў кожным з іх абавязкова ёсць тканая спадніца ці кашуля: "Выткаць апошнія трэба, як кажуць, адзін у адзін: як тое раней рабілі нашы бабулі. Пры тым важна ўзнавіць і паўтарыць у адзенні не толькі спосаб ткацтва, але і ўзор, падабраць падобныя па якасці ды колеры ніткі. Гэта хутчэй своеасаблівая "навуковая праца", чым палёт фантазіі. Праца марудная, карпатлівая, спешка можа толькі шкодзіць". Абмежаванняў па часе на перастварэнне такіх узораў адзення звычайна няма: кожны крок плануецца на год наперад. Цікаўнасць да традыцыйнага касцюма вялікая, бо ён спрадвечна беларускі, у ім шмат аўтэнтыкі, а традыцыі выбару такіх строяў зберагаліся праз многія гады, пакаленні. Алеся Мятліцкая дэталёва "распрацавала", каб увасобіць у новым часе, Лунінецкі, Ляхавіцкі, Бярэзінскі ды іншыя строі. Кожны з іх мае адметнасці, адрозніваецца ад іншых. (Нагадаем, што беларускі нацыянальны строй — гэта комплекс адзення, абутку й аксэсуараў, які склаўся цягам стагоддзяў і які карыстоўваўся беларусамі ў штодзённым і святочным побыце. Аўтарытэтныя крыніцы па тэме — альбом "Беларускае народнае адзенне" (1981) ды альбом з мастацка-графічнымі рэканструкцыямі "Беларускія народныя строі" (2003) прафесара Міхася Раманюка. У альбоме 2003 года, які выдаў сын навукоўца Дзяніс (Міхася Фёдаравіча не стала ў 1997-м), на Мапе народных строяў выдзелена 23 пазіцыі. Каштоўнае й выданне "Традыцыйны беларускі касцюм" (выдавецтва "Беларуская навука", 2016), якое падрыхтавала Марыя Віннікава. Гэты альбом, гаворыцца ў анатацыі да яго, знаёміць з яркай мастацкай з'явай этнічнай культуры беларусаў — традыцыйным сялянскім касцюмам, яго рэгіянальнымі ды лакальнымі адметнасцямі. Выданне адрасаванае шырокаму колу чытачоў. — **Рэд.**).

На прадпрыемстве "Скарбніца" даўно пераканаліся, што даўнія тэхналогіі ткацтва можна з поспехам выкарыстаць і пры стварэнні сучасных рэчаў. Напрыклад, бабулі нашыя ўмелі на сваіх спадніцах выткаць своеасаблівыя пупы з нітак. Алеся вывучыла "сакрэт" і з дапамогай такога прыёма стварыла сучасны палантын. Ёсць у яе творчым набытку й дзве тканыя спадніцы, пры вырабе якіх яна сумясціла тканае палатно з натуральнай скурай. Ёй, як мастачцы па ткацтве, цікава ствараць рэчы, якія не вырабіць на сучаснай ткацкай машыне: для таго падыходзяць толькі кросны.

"З дапамогаю кроснаў мы змаглі выткаць прыгожыя сталовыя камплекты, дзе з палатна пучком нітак, аб'ёмна выбіваюцца рамонкі ці то макі. Мне ўвогуле падабаецца здзіўляць пакупніка! — дзеліцца мастачка. — Здавалася б, усё ўжо прыдумана і наўрад ці можна знайсці штосьці новае. Але паглыбляешся ў тэму ткацтва — і безназдейнасць адступае. Нейкі новы прыём ці спосаб могуць дапамагчы стварыць і новую рэч". Яна імкнецца, каб распрацаваныя-адаптаваныя ёю да нашага часу пакрывалы, абрусы й сурвэткі ўпісваліся і ў сучасны інтэр'ер. Быў выпадак, калі "яе пакрывала" ўбачыла дзякуючы інтэрнэту пакупніца з іншага горада, спецыяльна прыехала па яго здалёк, заплаціла немаленькія грошы — і была вельмі ўдзячная. Гэты выпадак не адзінкавы. Тыя, хто звяртаецца на прадпрыемства, каб замовіць рэчы, заўсёды застаюцца задаволенымі: бо набываюць "далёка не шырспажыў".

Кожны мастак, які прыходзіў працаваць на "Скарбніцу", спрабаваў сябе не толькі ў рэканструкцыі беларускага ткацтва на кроснах ("Сакрэты "белагаловых" прыгажунь" — ГР, 29.12.2020). Алеся Мятліцкая казала, што з Марыяй Мікалаеўнай у іх падобная адукацыя: Алеся закончыла мастацка-графічны факультэт у Віцебскім дзяржуніверсітэце імя П. М. Машэрава, Марыя Мікалаеўна — такі ж у Ленінградскім педінстытуце імя А. І. Герцана. Абедзьвюм у працы спатрэбілася веданне начартальнай геаметрыі ды ўменне маляваць. Кожная з іх ужо ў "Скарбніцы"



**Мастачка Алеся Мятліцкая (справа) разам з ткачыхай Алінай Жураўлёвай вырабляюць абрус**

традыцыйнага адзення, але і ў стварэнні сучасных рэчаў з выкарыстаннем прыёмаў, напрацовак, тэхналогій нашых папярэднікаў. Усе тыя творцы зрабілі свой унёсак у агульную скаронку "Скарбніцы", і распрацоўкі Алесі Мятліцкай — цяпер таксама здабытак прадпрыемства.

Лёсавызначальным для яе стала знаёмства і супрацоўніцтва са старэйшай навуковай супрацоўніцай Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы й літаратуры НАН Беларусі Марыяй Віннікавай. Мы пісалі раней, што Марыя Мікалаеўна таксама працавала на "Скарбніцы", ездзіла па вёсках і вывучала тэхналогіі вырабаў народных тканін, самастойна асвоіла розныя спосабы ў свой час асвоіла ручное ўзорнае ткацтва: яго ж тэхналогію важна ведаць дасканала, каб "правільна" задумваць ды ўвасабляць усё, што задумана. Алеся з Марыяй Мікалаеўнай разам і рэканструююць беларускія традыцыйныя строі. Марыя Віннікава дзеліцца каштоўнай інфармацыяй пра народнае адзенне з розных рэгіёнаў Беларусі, Алеся Мятліцкая — малюе яго, робіць эскізы й вырабляе разам з ткачыхамі прадпрыемства. Нядаўні сумесны іх "твор" — Лунінецкі строй, былі ды й будуць іншыя. Бо супрацоўніцтва — плённае, і такая ўдумлівая, высокамастацкая праца ў грамадстве запатрабаваная.

**Ганна Лагун**

ПРАЕКТЫ

# Дыяспара ў люстэрку навукі

**Адбыўся першы выпуск магістрантаў гістфака Беларускага дзяржуніверсітэта і гістфака Маскоўскага дзяржуніверсітэта імя М. В. Ламаносава, якія навучаліся па праграме "Гісторыя беларускай дыяспары"**

Гэта першая Міжнародная сумесная расійска-беларуская адукацыйная праграма па вывучэнні дыяспар. Яна стартавала два гады таму на базе двух універсітэтаў: БДУ і МДУ. Кіраўнік праграмы з беларускага боку, загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістфака БДУ Андрэй Прохараў згадвае, што калі ў 2019-м па гэтай праграме распачыналася магістарская падрыхтоўка, стан навуковага даследавання груп этнічных беларусаў па-за межамі Беларусі быў на зачатковым узроўні: "Многія і дагэтуль у нашай краіне не ўсвядомілі, што з сябе ўяўляюць розныя дыяспары, якім чынам паядноўваюцца людзі, што жывуць па-за межамі краіны свайго паходжання, якім чынам іх дзейнасць уплывае на мацярынскую дзяржаву. Падзяліцца сваім досведам узяліся калегі з гістфака МДУ: мы супрацоўнічаем з імі шмат гадоў па розных навуковых напрамках. У МДУ пэўны час працуе лабараторыя гісторыі дыяспар і міграцый пад кіраўніцтвам Аксаны Солапавай, намесніцы дэкана гістфака МДУ. Наша супляменніца да таго ж уваходзіць у розныя кіруючыя органы ФНКА Беларусаў Расіі, добра ведае сітуацыю з беларускімі суполкамі ў краіне. Гэта й прадвызначыла нашу агульную працу па стварэнні сумеснай магістарскай праграмы. Беларускія гісторыкі са свайго боку ўзялі на сябе выкладанне магістрантам гістарычных працэсаў фарміравання беларускай нацыі, пастараліся акрэсліць адметнасці беларускай нацыянальнай культуры, моўных і рэлігійных традыцый, міграцыйных працэсаў".



Андрэй Прохараў (у цэнтры) з магістрантамі ў храме

Андрэй Прохараў у межах праграмы чытае лекцыі пра рэлігійныя традыцыі беларусаў, тлумачыць, якім чынам фарміруецца рэлігійная ментальнасць жыхароў Беларусі, пры тым праводзіць паралелі з сучаснай прасторай Усходняй Еўропы. Асабліва тое цікава магістрантам з Расіі, якія займаюцца па праграме разам з калегамі з Беларусі. Яны са здзіўленнем адкрываюць для сябе, што ў нашай краіне побач з праваслаўнай верай вызнаюць і каталіцкую, і пратэстанцкую ды іншыя, а вернікі розных канфесій з павагай ставяцца адзін да адна-го.

Пад кіраўніцтвам Андрэя Прохарава магістарскую дысертацыю зрабіла ды абараніла Ганна Блізнюк з Беларусі. Яна даследавала "Аўстрыйскі вектар знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь і ўзаемадзеянне з беларускай дыяспарай у Аўстрыі ў канцы XX — пачатку XXI стагоддзяў". Па словах Андрэя Аркадзевіча, даследаваць дыяспару беларусаў у Аўстрыі было цікава: нашы супляменнікі да апошняга часу не мелі там сваёй аргструктуры й фактычна не былі згуртаваныя. Ганна склала ў працэсе працы апытальнік, які павінен быў дапамагчы ёй асэнсаваць сучаснае светаўспрыманне беларусаў, што жывуць у Аўстрыі. У сучасных умовах апытанне магчыма было правесці толькі праз інтэрнэт. На пытанні адказалі больш за 20 этнічных беларусаў. І гэта ўжо, можна сказаць, пачатак навуковага вывучэння беларусаў у Аўстрыі.

Тэму "Асаблівасці пасляваеннай міграцыі насельніцтва БССР як фактар фарміравання беларускай дыяспары Калінінградскай вобласці" даследаваў беларус Раман Зубачоў. А расіянка Кацярына Патрына зацікавілася "Беларускімі грамадскімі арганізацыямі Карэліі XXI стагоддзя". Усе тры выпускнікі магістратуры гістфака, што навучаліся па праграме, змаглі займець адразу два дыпломы: беларускага і расійскага ўзору. Дыпломы выдатнікаў ім уручылі ў МДУ, а беларуская сістэма вышэйшай адукацыі такога не прадугледжвае.

Па словах Андрэя Прохарава, праграмай "Гісторыя беларускіх дыяспар" зацікавіліся многія грамадскія арганізацыі ды вышэйшыя навучальныя ўстановы. Актывісты Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Беларусаў Расіі зацікаўлены ў тым, каб па ёй навучаліся нашы супляменнікі ў Расіі. Дагестанскі дзяржуніверсітэт мае намер прысылаць у БДУ сваіх студэнтаў, каб глыбей вывучаць беларускія звычаі, паколькі беларусы жывуць і ў Дагестане. Наогул, навукоўцы гавораць, што аналагічныя міжнародныя праграмы могуць быць распрацаваныя і з ВНУ іншых краін.

Летам 2021 года пройдзе трэці набор у магістратуру на навучанне па праграме. Цікава, што ўступныя экзамены абітурыенты здаюць у двух месцах: на гістфаку БДУ і гістфаку МДУ. Вучыцца студэнты будуць адзін год у БДУ, а другі (няпоўны) — у МДУ. Прыйдзецца ездзіць з Мінска ў Маскву і наадварот. Але ж маладым людзям падабаецца падарожнічаць і знаёміцца з новымі адукацыйнымі стандартамі.

**Ганна Лагун**

АЛІМПІЙСКІ НАСТРОЙ

# Са скейтам па жыцці

**Беларускіх спартсменаў-скейтбардыстаў на Алімпіядзе-2020 у Токіа пакуль няма, хоць аматараў экстрэмальнага катання на дошках з калёсамі ў краіне шмат. І створаны ў Мінску "Скейт-музей СССР".**

Зварот да "экзатычнай" тэмы тут — не выпадковы. Спартыўны свет жыве Алімпіядай, Беларусь 9 ліпеня ўрачыста правяла ў Японію сваіх спартсменаў. Нагадаем, на XXXII Алімпійскіх гульнях краіну прадстаўляюць 109 спартсменаў, яны змагаюцца за медалі ў 20 відах спорту. На адкладзенай на год Алімпіядзе-2020 упершыню скейтбордынг прадстаўлены як від алімпійскі. Экстрэмалы, сярод якіх і 12-13-гадовыя падлеткі, разыграюць у Японіі прэстыжныя — бо першыя алімпійскія! — чатыры камплекты скейт-узнагарод: у мужчын і жанчын у дысцыплінах "парк" ды "стрыт".

"Падштурхнулі" нас у скейт-тэму сябры з Турцыі: Дзмітрый і Любоў Федуновы. Цыркавыя артысты "з савецкім мінулым", што зберагаюць у сэрцах цёплыя ўспаміны пра Беларусь і Мінск, маюць надзею зноў сюды прыехаць. Падрабязней пра гэтых адкрытых, таленавітых людзей мы пісалі: "Баланс для дваіх" (часопіс "Беларусь. Belarus", №8, 2019, ёсць у інтэрнэце). Як і пра даўняе захапленне Дзмітрыя скейтам. На самым пачатку 80-х у Мурманску з бацькам-слесарам яны дадалі ў "падвеску" скейта спружыны. Без падказак зрабілі тое, што ў 1941 годзе было зафіксавана як вынаходка. І "скейт Федунова" Дзмітрый з часам асвоіў віртуозна: робіць на ім проста неверагодныя трукі. У свае 59 мае выдатную фізічную форму, па-ранейшаму паказвае на сцэне праграму "Мастацтва індыйскіх ёгаў".

А цяперашні кіраўнік Беларускай федэрацыі скейтбордынга Глеб Бенцыоўскі ў 1988-м быў мінчанінам, калі "запаў" на скейт, і першую дошку, расказваў, падаравала яму бабуля ў час летніх вакацый на Каўказе. Сям'я Глеба з Кабардзіна-Балкарыі пераехала жыць у Беларусь, і ёсць у яго звесткі, што родавыя карані продкаў з адметным прозвішчам маглі быць з беларускіх ці то польскіх тэрыторый. Калі Дзмітрый Федуноў выклаў у сацсетках свае скейт-трукі, то спасылкі трапілі й да Глеба. Дарэчы, скейтары з розных краін сябруюць. І Глеб, ствараючы ў Мінску ўнікальны "Скейт-музей СССР" (ёсць інфармацыя ў інтэрнэце), выкарыстоўваў свае міжнародныя сувязі для папаўнення экспазіцыі. У часе нядаўняй сустрэчы ён паказваў экспанаты (а іх ужо больш за 700!), згадваў: карэспандэнты з "Голасу Радзімы" прыязджалі ўлетку 1988-га на базу адпачынку "Зялёны Бор" Мінскага завода халадзільнікаў. Глеб там упершыню "засвяціўся" як скейтар-аматар, да таго ж у змене былі равеснікі з замежжа, з якімі потайкам ад дарослых яны трэніраваліся. Спадзяюся, мае калегі напісалі пра юнага скейтара, і ўдасца знайсці той нумар газеты, і што нашае выданне вось такім чынам паспрыяла развіццю гэтага — цяпер алімпійскага — віда спорту ў Беларусі.




SB.BY

Глеб Бенцыоўскі

Скейт-трукі цыркавога ёга Дзмітрыя ўразілі "класічнага" скейтара Глеба. Ды ўсё ж ён лічыць, што такі занятак не стане масавым: далёка не ўсім пад сілу рабіць такое. Скажам, каб віртуозна валодаць целам, аб'язджаць сотні фішак, рухаючыся спіной наперад — патрэбныя гады ўпартых трэніровак.

Дзмітрый Федуноў сапраўды стаіць асобкам ад іншых скейтараў, і ягонае майстэрства, блізкае да мастацтва, складана некаму паўтарыць. Але скейт-энтузіяст упэўнены: многія трукі ў сучасным скейтбордзе занадта рызыкоўныя, траўманебяспечныя. І трэба даць скейтарам новы імпульс, паказаць для моладзі магчымы кірунак руху: па лініі "спартыўнага мастацтва", гульнёвых відаў. Дзмітрый прыдумаў гульні "Скейтборды Чапаеў", "Скейтборды більярд", скейтбол і шэраг іншых. А ці будуць у яго "віртуознага скейтбордынга" прыхільнікі, паслядоўнікі — пакажа час. Вось жа і не думаў ніхто раней, што стане скейт алімпійскім відам спорту — а стаў!

**Іван Ждановіч**

2021: Год народнага адзінства

Чытайце газету ў інтэрнэце на партале zviazda.by

**Заснавальнік:** Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»"
**Галоўны рэдактар** Іван ЖДАНОВІЧ

**Адрас рэдакцыі:** 220034, Мінск, вул. Захарава, 19. Пакой 19.
**E-mail:** golas_radzimy@tut.by

**Рэдакцыйнае пасведчанне №61.** Выдадзена 16.07.2018 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Выдавец:** Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»". Дырэктар – галоўны рэдактар Алесь Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

**Аб'ём выдання:** 2 друк. арк.
**Падпісана да друку:** 29.07.2021 г.
**Наклад 167.**
**Заказ –**
Выходзіць 1 раз у месяц

**Месца друкавання:** Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "БудМедыяПраект". ЛП №02330/71 ад 23.01.2014. Вул. Веры Харужай, 13/61. 220123 Мінск, Рэспубліка Беларусь

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца. Пазіцыі рэдакцыі ды аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2021